Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Першы прарэктар БДУКМ
______________ Н. У. Карчэўская
«____» _____________ 2018 г.
Рэгістрацыйны № _____

# ПРАГРАМА
# ВУЧЭБНАЙ І ВЫТВОРЧАЙ ПРАКТЫКІ

*для спецыяльнасці*
*1-17 01 05 Рэжысура свят (па напрамках),*
*напрамкаў спецыяльнасці*
*1-17 01 05-01 Рэжысура свят (народныя),*
*1-17 01 05-02 Рэжысура свят (тэатралізаваныя)*

2018

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**СКЛАДАЛЬНІКІ:**
*А. Я. Камінскі*, старшы выкладчык кафедры рэжысуры абрадаў і свят установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»;
*А. В. Катовіч,* старшы выкладчык кафедры рэжысуры абрадаў і свят установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»;
*І. А. Малахава,* загадчык кафедры псіхалогіі і педагогікі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», доктар педагагічных навук, дацэнт

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**
кафедрай рэжысуры абрадаў і свят установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 1 ад 13.09.2017);
саветам факультэта традыцыйнай беларускай культуры і сучаснага мастацтва ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 1 ад 30.08.2017)

Адказны за рэдакцыю: В. Б. Кудласевіч
Адказны за выпуск: А. Я. Камінскі

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Сучаснае развіццё адукацыйнай сістэмы вышэйшай школы першай ступені, якая забяспечвае падрыхтоўку кампетэнтных і кваліфікаваных спецыялістаў, патрабуе ад выпускнікоў кафедры рэжысуры абрадаў і свят адаптацыі і пасяховай прафесійнай дзейнасці на працоўным месцы пасля дзяржаўнага размеркавання. Гэта немагчыма без выдатнага валодання спецыяльнымі ўменнямі і навыкамі па арганізацыі і правядзенні святочных мерапрыемстваў, відовішчаў і тэатралізаваных прадстаўленняў, абрадаў, гульнявых праграм, работы з дзецьмі па развіцці іх выканальніцкіх здольнасцей. Студэнты набываюць патрэбныя веды, уменні і навыкі падчас аўдыторных заняткаў, але і падчас практыкі: пры ўдзеле ў падрыхтоўцы і правядзенні культурна-масавых мерапрыемстваў раённага, гарадскога, рэспубліканскага і міжнароднага ўзроўняў, заняткаў з дзецьмі ў творчых калектывах устаноў культуры і адукацыі. Практыка студэнтаў з'яўляецца абавязковай і адной з галоўных частак падрыхтоўкі высокакваліфікаваных спецыялістаў у галіне рэжысуры свят.

Вучэбная праграма складзена на аснове адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі ОСВО 1-17 01 15-2013 па спецыяльнасці 1-17 01 05 Рэжысура свят (па напрамках), вучэбнага плана ўстановы вышэйшай адукацыі па напрамках спецыяльнасці Рэжысура свят 1-17 01 05-01 (народныя), 1-17 01 05-02 Рэжысура свят (тэатралізаваныя); пастановы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 3 чэрвеня 2010 г. № 860 «Об утверждении Положения о практике студентов, курсантов, слушателей»; Інструкцыі аб парадку і асаблівасцях праходжання практыкі студэнтамі, якім пасля завяршэння навучання надаюцца педагагічныя кваліфікацыі, зацверджанай пастановай Міністэрства адукацыі 20.03.2012 № 24; тыпавога вучэбнага плана і графіка адукацыйнага працэсу.

Практыка падраздзяляецца на вучэбную і вытворчую.

Вытворчая практыка ўключае практыку па напрамку спецыяльнасці, педагагічную і пераддыпломную.

Вучэбная (азнаямленчая) практыка студэнтаў – II курс (2 семестр, 54 гадзіны).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Вытворчая (рэжысёрская) практыка студэнтаў – III курс (1 семестр, 108 гадзін).

Вытворчая (педагагічная) практыка студэнтаў – III курс (2 семестр, 108 гадзін).

Вытворчая (пераддыпломная) практыка студэнтаў – IV курс (на працягу года без адрыву ад заняткаў, 216 гадзін).

*Базамі практыкі* з'яўляюцца ўстановы культуры і адукацыі.

Для студэнтаў завочнай формы атрымання адукацыі практыка арганізоўваецца ў міжсесіённы перыяд з захоўваннем колькасці гадзін.

*Мэта* практыкі – замацаванне ведаў, атрыманых у працэсе навучання ва ўніверсітэце, і авалоданне ўменнямі і навыкамі рэжысёра тэатралізаваных прадстаўленняў і масавых свят.

Асноўныя *задачы* практыкі:

– паглыбіць і ўмацаваць веды студэнтаў у галіне рэжысуры свят;

– выпрацаваць асноўныя навыкі работы рэжысёра-пастаноўшчыка ў вытворчых умовах устаноў культуры ці ўстаноў адукацыі;

– адаптаваць студэнта да калектыўнага супрацоўніцтва ў складзе пастановачнай групы;

– сфарміраваць навыкі педагагічнай дзейнасці ў галіне спецыяльных мастацкіх дысцыплін (асновы рэжысуры і майстэрства акцёра, рэжысура свята, асновы драматургіі, моўнае дзеянне ў свяце, пластычная культура, музычна-шумавое рашэнне свята, мастацка-дэкаратыўнае рашэнне свята, сцэнаграфія свята інш.);

– падрыхтаваць студэнта да работы ў сферы святочнай культуры.

На працягу практыкі студэнты набываюць вопыт творчай, арганізацыйнай і педагагічнай работы, авалодваюць сучаснымі тэхналогіямі і методыкамі ў галіне рэжысуры свят. У цэнтры ўвагі практыкі павінна быць фарміраванне сістэмы асноўных базавых прафесійных ведаў і ўменняў, якія забяспечаць вырашэнне канкрэтных вытворчых задач і сітуацый. Разам з тым гэта агульная важнейшая праблема прафесійнай падрыхтоўкі маладых спецыялістаў павінна вырашацца індывідуальна, улічваючы асобасныя асаблівасці і магчымасці канкрэтнага студэнта.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ЗМЕСТ ПРАКТЫКІ

Праграма практыкі прадугледжвае фарміраванне ў будучага спецыяліста ў галіне святочнай культуры акадэмічных, сацыяльна-асобасных і прафесійных кампетэнцый. Да *акадэмічных* кампетэнцый належаць:

– умець выкарыстоўваць базавыя навукова-тэарэтычныя веды для вырашэння тэарэтычных і практычных задач;

– валодаць сістэмным і параўнальным аналізам;

– умець працаваць самастойна;

– быць здольным параджаць новыя ідэі (валодаць крэатыўнасцю);

– валодаць міждысцыплінарным падыходам пры рашэнні праблем;

– валодаць навыкамі вуснай і пісьмовай камунікацыі;

– умець вучыцца, самастойна павышаць сваю кваліфікацыю на працягу ўсяго жыцця;

– валодаць метадамі і сродкамі пазнання, навучання, самакантролю для інтэлектуальнага развіцця, павышэння культурнага ўзроўню, прафесійнай кампетэнцыі.

Да *сацыяльна-асобасных* кампетэнцый належаць:

– валодаць якасцямі грамадзянскасці;

– быць здольным да сацыяльнага ўзаемадзеяння;

– валодаць здольнасцю да міжасобасных камунікацый;

– быць здольным да крытыкі і самакрытыкі;

– быць здольным асэнсавана ўспрымаць і беражліва адносіцца да гістарычнай, культурнай спадчыны Беларусі і свету, культурных традыцый і рэлігійных поглядаў.

Да *прафесійных* кампетэнцый належаць:

– ажыццяўляць работу пастановачных груп па арганізацыі і правядзенні розных форм святочнай культуры;

– кантраляваць работу творчага, кіраўнічага, тэхнічнага падраздзяленняў арганізацыйнага камітэта па розных пытаннях арганізацыі і правядзення свята;

– арганізоўваць работу творчых калектываў падчас правядзення свят для дасягнення пастаўленых мэт і задач;

– выкарыстоўваць нарматыўна-прававую базу галіны культуры;

– узаемадзейнічаць са спецыялістамі сумежных профіляў;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– праводзіць культурна-асветніцкія мерапрыемствы для выхавання мастацка-эстэтычнага густу ўсіх катэгорый насельніцтва ва ўстановах культуры, спорту і адукацыі і іншых установах;

– наладжваць творчыя семінары, круглыя сталы для дзеячаў культуры і мастацтва падчас падрыхтоўкі свята;

– выступаць у сродках масавай інфармацыі з мэтай данясення звестак аб правядзенні свята;

– праводзіць адбор рэпертуару мастацкіх твораў з мэтай захавання і трансляцыі народнай творчасці;

– распрацоўваць і ўвасабляць рэжысёрскія праекты розных святочных форм;

– выкарыстоўваць новыя кірункі ў сучасных рэжысёрскіх тэхналогіях;

– весці перамовы па арганізацыі выканальніцкай дзейнасці;

– карыстацца інфармацыйнымі рэсурсамі па ўдакладненні сучасных умоў, зместу і сацыяльнай запатрабаванасці выканальніцкай і рэжысёрскай дзейнасці;

– распрацоўваць фальклорна-этнаграфічны матэрыял традыцыйных абрадаў і свят, на іх аснове праводзіць рэстаўрацыю, рэканструкцыю ці трансфармацыю ў сучасным свяце;

– ажыццяўляць на аснове культурна-гістарычнай спадчыны новыя святочныя формаўтварэнні ў сучасным сацыякультурным асяроддзі;

– ладзіць арганізацыю і правядзенне маштабных фестываляў на адкрытай прасторы, прысвечаных актуальным пытанням сучаснага грамадства;

– распрацоўваць анкеты для збору звестак па праблемах развіцця і захавання народнай творчасці, запатрабаванасці ў соцыуме свят разнастайных кірункаў;

– ажыццяўляць назіранне за бытаваннем розных відаў і жанраў народнай творчасці ў мэтах іх аховы і пераемнасці;

– выкарыстоўваць прынцып сістэмнага падыходу да рэалізацыі рэжысёрскіх праектаў у галіне святочнай культуры;

– рэгуляваць зносіны ў творчым і адукацыйным працэсе падчас арганізацыі і правядзення свят;

– выкарыстоўваць аптымальныя тэхналогіі навучання выканаўцаў і ўдзельнікаў свята, дапасоўваць іх да сэнсажыццёвых каштоўнасцей;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– вызначаць творчы і арганізацыйны патэнцыял удзельнікаў выканальніцкай і пастановачнай груп для эфектыўнай работы падчас арганізацыі і правядзення свята;

– працаваць з вучэбнымі планамі і праграмамі, улічваць метадычныя рэкамендацыі па праблемах арганізацыі навучання і выхавання сродкамі народнай творчасці;

– улічваць псіхалагічныя асаблівасці навучэнцаў і практыкаваць індывідуальны падыход для вырашэння мэт і задач навучання і выхавання.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# АЗНАЯМЛЕНЧАЯ ПРАКТЫКА

Азнаямленчая практыка студэнтаў праводзіцца без адрыву ад аўдыторных заняткаў.

*Мэта* практыкі – азнаямленне студэнтаў з умовамі работы рэжысёраў свят, жанравай разнастайнасцю мерапрыемстваў, якія праводзяцца ва ўстановах культуры і адукацыі ў галіне культуры, з этапамі арганізацыі мерапрыемстваў (планаванне, складанне арганізацыйнага плана, напісанне сцэнарыя і г. д.), правядзеннем рэпетыцыйнага працэсу і самога прадстаўлення, свята.

*Задачы* практыкі:

– атрымаць пачатковыя веды па падрыхтоўцы, правядзенні святочных мерапрыемстваў і набыць уменні аналізаваць іх арганізацыю і ўвасабленне ва ўмовах назірання за ходам творчага працэсу;

– абагульніць асноўныя кірункі дзейнасці, выкарыстанне разнастайнасці жанраў пры планаванні і правядзенні святочных мерапрыемстваў ва ўстановах культуры;

– прасачыць канцэпцыю ў арганізацыі і правядзенні святочных мерапрыемстваў гадавога цыкла, тэатралізаваных, мастацка-спартыўных прадстаўленняў, відовішчаў, масавых свят ва ўстанове культуры;

– прапанаваць схему арганізацыі і правядзення рэпетыцыйнага працэсу па ўвасабленні святочных мерапрыемстваў, сведкамі якіх былі студэнты на працягу азнаямленчай практыкі.

*Базай* практыкі з’яўляюцца ўстановы культуры або ўстановы адукацыі ў галіне культуры.

*Кіраўніцтва* азнаямленчай практыкай ажыццяўляе выкладчык кафедры рэжысуры абрадаў і свят.

Практыка прадугледжвае сустрэчы студэнтаў з кіраўніцтвам і супрацоўнікамі базы практыкі па профілю спецыяльнасці. Кіраўнік ад базы практыкі мае права прадстаўляць па просьбе кіраўніка практыкі ад кафедры і студэнтаў дакументацыю праведзеных свят (планы культурна-масавых мерапрыемстваў на год, арганізацыйныя планы мерапрыемстваў, сцэнарыі, каштарысы свят, відэазапісы лепшых мерапрыемстваў). Студэнты разам з кіраўніком практыкі ад кафедры знаёмяцца з планам правядзення мерапрыемстваў на месяц, наведваюць па дамоў-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ленасці з дырэктарам, мастацкім кіраўніком, рэжысёрам масавых свят базы практыкі зводныя, тэхнічныя і генеральныя рэпетыцыі, прысутнічаюць на мерапрыемствах.

## ВЫТВОРЧАЯ ПРАКТЫКА

Рэжысёрская практыка праводзіцца без адрыву ад аўдыторных заняткаў і ў прафесійнай падрыхтоўцы творчых кадраў з'яўляецца неад'емнай часткай вучэбна-выхаваўчага працэсу і асноўным звязуючым этапам паміж творчай падрыхтоўкай і самастойнай работай будучых рэжысёраў тэатралізаваных прадстаўленняў і народных свят.

*Мэтай* вытворчай практыкі з'яўляецца знаёмства з галоўнымі заканамернасцямі метадычнай і арганізатарскай работы з выканаўцамі, мастацкімі калектывамі падчас падрыхтоўкі святочнай дзеі, рэалізацыя навыкаў даследчай работы, замацаванне, паглыбленне і творчае прымяненне тэарэтычных ведаў, практычных навыкаў і ўменняў у галіне святочнай культуры, а таксама прадзюсарскага майстэрства ў сваёй творчай дзейнасці.

*Задачы* вытворчай практыкі:

– замацаваць веды, уменні і навыкі ў прафесійнай дзейнасці ў галіне рэжысуры свят і тэатралізаваных прадстаўленняў, культурнай палітыцы і кіравання, арт-менеджменту і прадзюсарскага майстэрства;

– набыць педагагічныя навыкі і ўменні ў рабоце з творчымі калектывамі пры падрыхтоўцы разнажанравых святочных дзей;

– пазнаёміцца з культурна-відовішчнай дзейнасцю, распрацоўкай і ўкараненнем інавацыйных тэхналогій рэжысуры масавых свят і тэатралізаваных прадстаўленняў для ўсіх катэгорый насельніцтва ўстановамі культуры і мастацтва, а таксама вывучэнне вопыту работы па спецыяльнасці;

– назапасіць і асэнсаваць вопыт творчай, рэжысёрска-пастановачнай, арганізацыйнай, мастацка-асветніцкай, праектнай, навуковай дзейнасці ва ўстанове (базе практыкі).

*Базай* практыкі з'яўляюцца ўстановы культуры і адукацыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ПЕДАГАГІЧНАЯ ПРАКТЫКА

Педагагічная практыка з’яўляецца вынікам вывучэння студэнтамі псіхолага-педагагічных дысцыплін.

Педагагічная практыка скіравана на засваенне студэнтамі педагагічных працэсаў і з’яў у навучальных установах, фарміраванне творчых здольнасцей і якасцей асобы будучага настаўніка.

*Мэта* педагагічнай практыкі – авалоданне студэнтамі практычнымі навыкамі і ўменнямі, а таксама тэхналогіяй выкладання спецыяльных дысцыплін (асновы рэжысуры і майстэрства акцёра, рэжысура свят, сцэнарнае майстэрства, моўнае дзеянне ў свяце, музычнае рашэнне свята, абрадава-святочная дзейнасць, мастацка-дэкаратыўнае рашэнне свята і гісторыя свят), а таксама знаёмства з арганізацыяй вучэбнай і выхаваўчай работы ў творчых калектывах, установах адукацыі і культуры (ансамбль, хор, сярэдняя школа, гімназія, гурток і студыя па інтарэсах).

*Задачы* педагагічнай практыкі:

– паглыбленне і замацаванне тэарэтычных ведаў па дысцыплінах псіхолага-педагагічнага цыкла, выкладаемых ва ўніверсітэце, іх ужыванне ў вырашэнні дакладных педагагічных і творчых задач;

– фарміраванне і развіццё практычных навыкаў выкладання дысцыплін спецыялізацыі;

– апрабацыя разнастайных, у тым ліку інавацыйных, метадаў і сродкаў навучання, азнаямленне з перадавым педагагічным вопытам;

– выкарыстанне методыкі падрыхтоўкі да ўрока і выкладання вучэбнага матэрыялу ў залежнасці ад узросту навучэнцаў (вызначэнне мэты і зместу ўрока, выбар метадаў і прыёмаў дзеля дасягнення мэты ўрока, складанне плана і канспекта ўрока, падбор і падрыхтоўка наглядных дапаможнікаў і тэхнічных сродкаў і г. д.);

– засваенне навыкаў самастойнага вядзення індывідуальных заняткаў па спецдысцыплінах.

*Базай* практыкі з’яўляюцца ўстановы адукацыі і ўстановы адукацыі ў галіне культуры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Кіраўніцтва.* Для ажыццяўлення педагагічнай практыкі вызначаюцца два кіраўнікі: выкладчык ад кафедры рэжысуры абрадаў і свят, выкладчык ад кафедры псіхалогіі і педагогікі. Абодва кіраўнікі ў адпаведнасці з праграмай складаюць план праходжання практыкі, індывідуальныя заданні для студэнтаў. У абавязкі кіраўнікоў практыкі ўваходзіць кантроль за яе ходам, прыманне дыферэнцыраванага заліку па практыцы, паведамленне яе вынікаў на пасяджэннях кафедры.

## ПЕРАДДЫПЛОМНАЯ ПРАКТЫКА

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Пераддыпломная практыка студэнтаў праводзіцца па зацверджаным плане з замацаваннем за кожным студэнтам кіраўніка практыкі і канкрэтнага задання па дыпломным праекце. Вынікам выканання пастаўленага задання з'яўляецца дыпломная пастаноўка і станоўчая справаздача аб праходжанні практыкі. Пераддыпломная практыка скіравана на самастойную распрацоўку і пастаноўку тэатралізаванага прадстаўлення, масавага свята, прадугледжвае аўтарска-рэжысёрскую рэалізацыю выпускной кваліфікацыйнай работы, абарона якой праводзіцца перад дзяржаўнай экзаменацыйнай камісіяй.

*Мэта* пераддыпломнай практыкі – прадаставіць студэнтам магчымасць самастойнага выкарыстання ў практычнай дзейнасці рэжысёра свят комплексу тэарэтычных ведаў і практычных уменняў, атрыманых студэнтамі ў працэсе авалодання вучэбным матэрыялам усіх вывучаных вучэбных дысцыплін.

У працэсе пераддыпломнай практыкі вырашаюцца наступныя *задачы*:

– вывучэнне сучасных магчымасцей індывідуальнай і калектыўнай творчай дзейнасці ў сучаснай практыцы пастаноўкі абрадава-рытуальных дзей, тэатралізаваных прадстаўленняў, масавых свят;

– адпрацоўка канкрэтных практычных навыкаў арганізацыйна-творчай дзейнасці рэжысёра ў падрыхтоўцы свят і прадстаўленняў, якія праводзяцца па плане базавай установы культуры;

– авалоданне практычнымі навыкамі рэжысуры і майстэрства акцёра, спосабамі выкарыстання сродкаў мастацкай выразнасці пры пастаноўцы мастацка-спартыўных, абрадава-

фальклорных, карнавальна-фестывальных, канцэртна-відовішчных тэатралізаваных дзей;

– практычнае прымяненне прыёмаў творчага мантажу мастацкага матэрыялу розных форм і жанраў у цэласнае тэатралізаванае дзеянне;

– вывучэнне і ўкараненне ў практычную дзейнасць рэжысёра сучасных метадаў у арганізацыі і пастаноўцы тэатралізаваных прадстаўленняў, масавых свят;

– вывучэнне навейшых тэхналогій у галіне рэжысуры і пастановачнай дзейнасці масавых тэатралізаваных дзей (аб'ёмны гук, дынамічнае святло, камп'ютарная графіка, відэа-, тэлевізійныя сістэмы, мастацкая піратэхніка і г. д.);

– знаёмства з рознымі відамі і формамі мастацкіх відовішчаў і масавых свят.

*Базай* практыкі з'яўляюцца ўстановы культуры або адукацыі ў галіне культуры.

*Кіраўніцтва* пераддыпломнай практыкай ажыццяўляе выкладчык кафедры рэжысуры абрадаў і свят.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## МЕТАДЫЧНЫЯ РЭКАМЕНДАЦЫІ ДЛЯ СТУДЭНТАЎ І КІРАЎНІКОЎ

*Абавязкі кафедры рэжысуры абрадаў і свят:*

– распрацаваць праграмы практыкі згодна з замацаванай спецыяльнасцю і зацвердзіць іх;

– прызначаць кіраўнікоў практыкі і адказнага за практыку на кафедры;

– рыхтаваць прапановы аб размеркаванні студэнтаў на практыку па базавых арганізацыях; аб зацвярджэнні баз практыкі;

– размеркаваць студэнтаў-практыкантаў паміж кіраўнікамі практыкі ад кафедры;

– ажыццяўляць кантроль за праходжаннем практыкі;

– разглядаць і зацвярджаць справаздачы кіраўнікоў практыкі;

– забяспечваць кіраўнікоў практыкі і студэнтаў неабходнымі метадычнымі распрацоўкамі, праграмамі і формамі справаздачнасці.

*Абавязкі кіраўнікоў практыкі ад кафедры рэжысуры абрадаў і свят:*

– праводзіць арганізацыйныя мерапрыемствы са студэнтамі перад пачаткам практыкі;

– складаць індывідуальны графік праходжання практыкі кожным студэнтам (сумесна з кіраўніком ад базы практыкі);

– забяспечваць адпаведнасць практыкі яе праграмам;

– здзяйсняць кантроль за вядзеннем дзённікаў студэнтамі-практыкантамі;

– ажыццяўляць вучэбна-метадычнае забеспячэнне праходжання практыкі;

– здзяйсняць кантроль за сістэматычным наведваннем студэнтамі базы практыкі;

– разглядаць справаздачы студэнтаў і рыхтаваць пісьмовую справаздачу па выніках практыкі з прапановамі па яе ўдасканаленні;



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– выстаўляць адзнаку ў заліковыя кніжкі і залікова-экзаменацыйную ведамасць пасля падвядзення вынікаў практыкі.

*Абавязкі студэнта-практыканта:*

– скласці графік праходжання практыкі;

– весці дзённік, дзе неабходна адлюстроўваць выкананне плана праходжання практыкі;

– дакладна выконваць запланаваныя заданні, запісваць змест і вынікі работы за кожны дзень практыкі;

– падпарадкоўвацца правілам унутранага распарадку базы практыкі;

– актыўна ўдзельнічаць у жыцці калектыву базы практыкі, яго творчай рабоце.

*Падвядзенне вынікаў практыкі.* Па заканчэнні практыкі студэнт падае пісьмовую справаздачу і здае кіраўніку практыкі дзённік. Справаздача павінна ўтрымліваць звесткі аб выкананай рабоце за перыяд практыкі.

Студэнт, які не выканаў праграму практыкі і атрымаў нездавальняючую адзнаку або быў хворы падчас праходжання практыкі, праходзіць яе паўторна ў перыяд студэнцкіх канікул або пасля заняткаў (па дамоўленасці з базай практыкі).

Агульная справаздача кіраўніка практыкі ад кафедры зацвярджаецца на пасяджэнні кафедры.

## АЗНАЯМЛЕНЧАЯ ПРАКТЫКА

Падчас азнаямленчай практыкі студэнтам неабходна выканаць наступныя заданні, якія складаюць яе асноўны змест:

– выявіць характэрныя кірункі культурна-дасугавай дзейнасці, разнастайнасць жанравых мерапрыемстваў на аснове азнаямлення з дакументацыяй па арганізацыі і правядзенні культурна-масавых мерапрыемстваў;

– скласці графік наведвання рэпетыцый і разбору дзеянняў рэжысёра-пастаноўшчыка на рэпетыцыях па расстаноўцы сэнсавых акцэнтаў;

– зрабіць аналіз святочных мерапрыемстваў, на якіх практыканты прысутнічалі як назіральнікі (дасягненні і недахопы пры ўвасабленні творчай задумы святочнага мерапрыемства;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

выкарыстанне ўдалых мізансцэн; водгукі гледачоў; цікавыя рэжысёрскія знаходкі і інш.).

*Заключная дакументацыя вучэбнай (азнаямленчай) практыкі.* Пасля заканчэння азнаямленчай практыкі студэнт-практыкант афармляе індывідуальны дзённік, які адлюстроўвае змест работы студэнта на практыцы, аналіз кірункаў культурна-масавай дзейнасці базавай установы, дакументацыю па арганізацыі і правядзенні відовішчаў, тэатралізаваных прадстаўленняў і святочных мерапрыемстваў.

Пасля падвядзення вынікаў заліку кіраўнік вучэбнай (азнаямленчай) практыкі кафедры падводзіць вынікі практыкі, характарызуе і ацэньвае работу студэнта.

## ВЫТВОРЧАЯ ПРАКТЫКА

Практычная дзейнасць студэнтаў ажыццяўляецца па некалькіх кірунках.

У галіне *рэжысёрска-пастановачнай дзейнасці* – удзел у распрацоўцы і рэалізацыі святочных дзей, канцэртна-відовішчных форм, мастацка-спартыўных, тэатралізаваных прадстаўленняў, шоу-праграм і г. д.; увасабленне сцэнарна-рэжысёрскай распрацоўкі эпізодаў тэатралізаванага прадстаўлення, свята і іншых форм святочнай культуры, накіраваных на культурна-эстэтычнае развіццё ўсіх катэгорый насельніцтва; правядзенне рэпетыцый з удзельнікамі мастацкай самадзейнасці ў прысутнасці выкладчыка і самастойна.

У галіне *арганізацыйна-кіраўніцкай дзейнасці* – ажыццяўленне прадзюсіравання ў сферы тэатралізаваных прадстаўленняў і масавых свят, кіраўніцтва калектывам або студыяй, удзел у працэсах арт-менеджменту і адукацыйных працэсах ва ўстановах адукацыі.

У галіне *мастацка-асветніцкай дзейнасці* – фарміраванне навакольнага культурнага асяроддзя і мастацка-эстэтычнага выхавання ўсіх катэгорый насельніцтва; ажыццяўленне прафесійных кансультацый пры падрыхтоўцы творчых праектаў у сферы святочнай культуры.

У галіне *навукова-даследчай і праектнай дзейнасці* – рэалізацыя рэжысёрскіх праектаў, падрыхтоўка сцэнарыяў і рэжысёрскіх эксплікацый, збор навуковага матэрыялу і падрыхтоўка

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дакладаў па заяўленай праблеме даследавання; валоданне метадамі работы з сучаснымі электроннымі носьбітамі інфармацыі; уменне працаваць з бібліятэчным матэрыялам, аналізаваць і даваць аргументаваную ацэнку працэсам, якія адбываюцца ў галіне мастацтва, сучаснай святочнай культуры.

На абарону вытворчай практыкі студэнтам прадстаўляецца наступная заключная дакументацыя:

– характарыстыка базы практыкі (установа, сістэма кіравання, спецыфіка, падраздзяленні, змест дзейнасці і інш.);

– справаздача аб праходжанні практыкі;

– індывідуальны план работы (завераны подпісам кіраўніка практыкі);

– індывідуальны дзённік практыкі (з подпісам кіраўніка ўстановы базы практыкі, завераным пячаткай);

– характарыстыка практыканта і яго дзейнасці на практыцы (з подпісам кіраўніка ўстановы базы практыкі, завераным пячаткай);

– дадатак, у які ўваходзяць: рэжысёрская дакументацыя мерапрыемстваў, у якіх студэнт-практыкант прымаў удзел (сцэнарыі, праекты, афішы, запрашальныя білеты, фанаграмы і г. д.);

– сцэнарыі падрыхтаваных і праведзеных асабіста студэнтам святочных мерапрыемстваў.

Пасля падвядзення вынікаў дыферэнцыраванага заліку кіраўнік ад кафедры пісьмова аналізуе дзейнасць кожнага практыканта і выстаўляе адзнаку.

## ПЕДАГАГІЧНАЯ ПРАКТЫКА

Падчас правядзення педагагічнай практыкі кожны студэнт абавязаны выканаць наступныя *заданні,* якія адлюстроўваюць яе змест (метадычныя рэкамендацыі змешчаны ў інфармацыйна-метадычнай частцы праграмы):

1) наведаць заняткі па розных дысцыплінах, якія праводзяць выкладчыкі базавай установы;

2) самастойна правесці кантрольны занятак з навучэнцамі па спецдысцыпліне (1 гадзіна);

3) прыняць удзел у арганізацыі, падрыхтоўцы і правядзенні свята, абраду, відовішча ў базавай установе;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

4) азнаёміцца з патэнцыяльнымі (творчымі і фінансавымі) магчымасцямі базы практыкі.

У *індывідуальны план* па педагагічнай практыцы могуць быць уключаны наступныя віды работ:

– планаванне заняткаў розных тыпаў;

– распрацоўка плана канспекта ўрока;

– азнаямленне з методыкай ацэнкі і кантролю ведаў;

– распрацоўка і правядзенне пазакласнага мерапрыемства;

– правядзенне гутарак з вучнямі, вывучэнне асобы дадзенай узроставай групы (на прыкладзе аднаго з вучняў як аб'екта вывучэння) і складу творчага калектыву ўвогуле;

– напісанне псіхолага-педагагічных характарыстык на асобнага вучня ці вучэбны (творчы) калектыў;

– падрыхтоўка пісьмовага псіхолага-педагагічнага аналізу індывідуальных і групавых заняткаў;

– падрыхтоўка, правядзенне і вызначэнне педагагічнай эфектыўнасці ўрокаў і выхаваўчых мерапрыемстваў.

*Заключная дакументацыя.* Пасля заканчэння педагагічнай практыкі студэнт афармляе індывідуальны дзённік, які адлюстроўвае змест работы на практыцы (падпісваецца кіраўнікамі ад базы практыкі і кафедры), складае пісьмовую справаздачу, якая ўтрымлівае наступныя дакументы:

1) план-канспект праведзенага самастойна кантрольнага ўрока (занятку) (адзін адкрыты ўрок);

2) пратакол праведзенага самастойна кантрольнага ўрока (занятку) (адзін адкрыты ўрок) за подпісам членаў камісіі, якія прысутнічалі на ўроку;

3) псіхолага-педагагічны аналіз урокаў па спецдысцыплінах, наведаных падчас педагагічнай практыкі (дзесяць пасіўных урокаў);

4) псіхолага-педагагічную характарыстыку вучня (удзельніка мастацкага калектыву) або псіхолага-педагагічную характарыстыку дзіцячага мастацкага калектыву базы практыкі;

5) характарыстыку на студэнта ад установы – базы практыкі з ацэнкай якасці педагагічнай падрыхтоўкі студэнта і адзнакай за педагагічную практыку за подпісам кіраўніка гэтай установы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Дадаткова прадстаўляюцца сцэнарыі пазакласных урокаў, у якіх студэнт браў удзел падчас праходжання практыкі, фота-, відэаматэрыялы і інш.

Змест і якасць афармлення дакументацыі ўлічваецца пры вывядзенні выніковай адзнакі за педагагічную практыку.

*Форма кантролю.* Вынікам педагагічнай практыкі з'яўляецца дыферэнцыраваны залік (праводзіцца праз тыдзень пасля заканчэння практыкі), на якім кіраўнікі практыкі ад двух кафедр пасля абмеркавання выстаўляюць студэнту адзнаку за ўдзел у педагагічнай практыцы.

*План псіхолага-педагагічнай характарыстыкі вучэбна-творчага калектыву*

1. Агульныя звесткі пра калектыў і гісторыю яго стварэння: колькасць удзельнікаў, у тым ліку мужчын і жанчын, узроставы склад, калі сфарміраваўся калектыў, ці мяняліся кіраўнікі і г. д.

2. Кіраўніцтва і арганізацыя творчага калектыву: ядро, якое яднае калектыў, яго актыў, кіраўнік (стараста) і яго работа; характарыстыка актывістаў (ініцыятыўнасць, самастойнасць, патрабавальнасць да сябе і іншых, аўтарытэт у калектыве, арганізатарскія здольнасці).

3. Узаемаадносіны ўнутры калектыву: характар дзелавых і міжасобасных адносін, ступень згуртаванасці.

4. Характарыстыка вучэбна-творчай дзейнасці калектыву: паспяховасць у засваенні рэпертуару (рашэнне мастацка-творчых задач). Колькасць пасіўных удзельнікаў і іх невысокі ўзровень падрыхтоўкі; прычыны гэтага. Работа калектыву над рэпертуарам – наяўнасць кантролю, патрабаванні з боку кіраўніка, актыву, узаемадапамога, яе формы і арганізацыя. Наяўнасць адмоўных момантаў у вучэбна-творчай дзейнасці. Адносіны ўдзельнікаў калектыву да выпадкаў невыканання патрабаванняў кіраўніка. Салісты і канцэртмайстры (найбольш таленавітыя ўдзельнікі) у калектыве, ступень іх уплыву на калектыў.

5. Стан дысцыпліны ў калектыве: дысцыпліна на рэпетыцыях (занятках) і на канцэрце (творчым паказе). Прычыны дрэннай дысцыпліны. Меры, якімі падтрымліваецца дысцыпліна на рэпетыцыях. Уплыў асобных удзельнікаў на стан дысцыпліны.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Асноўныя метады барацьбы з парушальнікамі дысцыпліны. Стаўленне кіраўніка калектыву да выпадкаў парушэння дысцыпліны.

6. Узаемаадносіны калектыву з кіраўніком: роля кіраўніка ў калектыве. Стыль і метады работы. Стаўленне калектыву да свайго кіраўніка, яго аўтарытэт сярод артыстаў.

7. Жыццё калектыву па-за рэпетыцыямі і канцэртамі: цікаўнасць да сучасных падзей мастацтва, літаратуры і спорту, формы праяўлення. Удзел калектыву ў жыцці культурна-асветнай (навучальнай) установы.

8. Грамадская і дабрачынная дзейнасць калектыву.

9. Псіхолага-педагагічныя вывады, прапановы: у тым ліку мерапрыемствы, якія спрыяюць умацаванню міжасобасных адносін у калектыве.

*План псіхолага-педагагічнай характарыстыкі вучня (удзельніка творчага калектыву)*

1. Сацыяльна-дэмаграфічныя дадзеныя: прозвішча, імя, імя па бацьку; горад, навучальная ўстанова (творчы калектыў), узрост, клас (год навучання, стаж), сацыяльнае паходжанне, звесткі пра бацькоў, іх адносіны да выхавання дзяцей, іншае (нацыянальнасць, месца і ўмовы пражывання).

2. Стан здароўя: наяўнасць фізічных недахопаў, хранічных хвароб, магчымасць займацца пэўным відам мастацкай творчасці па стане здароўя і агульным фізічным развіцці.

3. Паспяховасць у мастацкім калектыве і навучальнай установе (агульнаадукацыйнай школе, школе мастацтваў, студыі і г. д.).

4. Хобі, захапленні.

5. Тэмперамент. Структура характару: адносіны да вучобы, выкладчыка (мастацкага кіраўніка), аднакласнікаў, да бацькоў, да працы (у калектыве, навучальнай установе, дома), да выканання грамадскіх даручэнняў.

6. Узровень развіцця псіхалагічных якасцей: увагі, успрымання, памяці, мыслення, уяўлення.

7. Узровень развіцця спецыяльных (мастацкіх) здольнасцей: эмацыянальная чуласць, слых, рытм, памяць, мысленне, успрыманне, уяўленне, маторныя здольнасці і інш.

8. Узровень развіцця мовы.

9. Эмацыянальна-валявыя ўласцівасці: эмацыянальная ўстойлівасць, мэтанакіраванасць, настойлівасць, арганізаванасць і інш.

10. Тыповыя маральныя якасці: адказнасць, самастойнасць, добрасумленнасць, калектывізм, дысцыплінаванасць, павага да іншых, таварыскасць, працавітасць.

11. Вывады: паказаць, якія індывідуальна-псіхалагічныя ўласцівасці навучэнца трэба ўлічваць пры арганізацыі вучэбна-выхаваўчай работы з ім.

*Схема самааналізу адкрытага ўрока*
*па спецдысцыпліне*

I. Уводзіны да ўрока

1. Стварэнне псіхалагічнага настрою.
2. Пастаноўка мэты.
3. Фарміраванне матываў навучання.

II. Забеспячэнне на ўроку

1. Дыдактычны матэрыял і тэхнічныя сродкі.
2. Мэтазгоднасць іх выкарыстання.

III. Змест урока

1. Адпаведнасць метадычнай структуры ўрока яго мэтам.
2. Даступнасць выкладання вучэбнага матэрыялу.
3. Дыферэнцыяцыя вучэбных заданняў.
4. Навуковасць зместу.
5. Арганізацыя і выкарыстанне міждысцыплінарных сувязей.
6. Маральная і светапоглядная накіраванасць урока.
7. Эстэтычнае ўздзеянне ўрока на вучняў.
8. Выкарыстанне эфектыўных метадаў навучання, іх варыятыўнасць.
9. Варыятыўнасць і эфектыўнасць форм кантролю за вучэбнай дзейнасцю навучэнцаў.
10. Актывізацыя цікавасці да прадмета, прымяненне гульнявых метадаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## IV. Псіхалагічныя аспекты ўрока

1. Змена відаў дзейнасці на ўроку.

2. Выкарыстанне розных відаў памяці (вобразная, моўна-лагічная, рухальная, эмацыянальная, зрокавая).

## V. Ацэнка дзейнасці навучэнцаў

1. Ступень актыўнасці.

2. Арганізаванасць і дысцыпліна.

3. Моўнае развіццё, уменне лагічна мысліць, аргументавана выкладаць свае думкі.

4. Развіццё харэаграфічных уменняў і навыкаў.

## VI. Ахова працы на ўроку

1. Падрыхтаванасць памяшкання (асвятленне, чысціня, стан паветра).

2. Назіранне за пастаavай навучэнцаў.

3. Наяўнасць дынамічнай паўзы.

## VII. Узаемадзеянне вучняў і настаўніка

1. Узровень педагагічнага майстэрства, культура, такт, знешні выгляд, мова выкладчыка.

2. Наяўнасць зваротнай сувязі.

3. Забеспячэнне спрыяльнага псіхалагічнага клімату.

## VIII. Вынікі ўрока

1. Выкананне намечанага плана, ступень дасягнення мэты.

2. Выкарыстанне выхаваўчых магчымасцей адзнакі.

## *Схема агульнапедагагічнага аналізу ўрока па спецдысцыпліне*

1. Месца дадзенага ўрока ў сістэме ўрокаў па дысцыпліне, правільнасць пастаноўкі мэты ўрока.

2. Арганізацыя ўрока:

а) тып урока;

б) структура ўрока; яго элементы, іх паслядоўнасць і дазіроўка ў часе; адпаведнасць будовы ўрока яго зместу і пастаўленай мэце;



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

в) падрыхтаванасць калектыву да ўрока;

г) арганізацыя актыўнай работы на працягу ўсяго ўрока; спалучэнне групавой і калектыўнай работы на ўроку;

д) насычанасць урока; рацыянальнае выкарыстанне часу.

3. Змест урока:

а) навуковасць і даступнасць вучэбнага матэрыялу;

б) правільнасць падбору матэрыялу для розных этапаў урока і відаў дзейнасці навучэнцаў;

в) адпаведнасць зместу ўрока патрабаванням праграмы;

г) выхаваўчая накіраванасць урока;

д) сувязь тэорыі з практыкай; раскрыццё выкладчыкам практычнага значэння ведаў; выкарыстанне ведаў на практыцы;

е) сувязь вывучаемага матэрыялу з папярэднімі ведамі; прыёмы паўтарэння;

ж) міждысцыплінарныя сувязі;

з) мова выкладчыка: арфаэпічная правільнасць, эмацыянальнасць, лексічнае багацце;

і) якасць ведаў, уменняў і навыкаў вучняў;

к) мова вучняў.

4. Методыка правядзення ўрока:

а) забеспячэнне і выкарыстанне дыдактычнага матэрыялу на ўсіх этапах урока;

б) метады і прыёмы прыцягнення ўвагі навучэнцаў на кожным этапе ўрока;

в) адпаведнасць метадаў зместу і мэтам урока, узросту і ўзроўню падрыхтоўкі вучняў; эфектыўнасць выкарыстаных метадаў;

г) пастаноўка выкладчыкам перад вучнямі мэты ўрока і падвядзенне вынікаў;

д) валоданне выкладчыкам метадамі актыўнага навучання; мэтазгоднасць выкарыстання гэтых метадаў на ўроку;

е) сістэма ацэнкі ведаў.

5. Зносіны на ўроку: тон, стыль, манера зносін з вучнямі.

6. Работа і паводзіны вучняў на ўроку:

а) актыўнасць;

б) цікавасць да матэрыялу ўрока;

в) адносіны да выкладчыка;

г) дысцыплінаванасць і арганізаванасць.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

7. Агульныя вывады ўрока. Улік вопыту, атрыманага на ўроку ў далейшай рабоце.

## ПЕРАДДЫПЛОМНАЯ ПРАКТЫКА

### *Рэкамендаваныя віды заняткаў і формы навучання студэнтаў-практыкантаў у рамках вытворчай практыкі*

1. Удзел у арганізацыйным сходзе студэнтаў для азнаямлення з мэтамі і задачамі практыкі.
2. Вызначэнне канкрэтнага зместу пераддыпломнай практыкі (для кожнага студэнта) і ўзгадненне яго з кіраўніком практыкі (індывідуальны план работы практыканта).
3. Знаёмства з базай практыкі (азнаямленне са спецыфікай работы, штатным раскладам і структурай базы практыкі).
4. Знаёмства з планам масавых мерапрыемстваў базавай установы.
5. Вывучэнне і аналіз работы творчых калектываў базы практыкі.
6. Карэкціроўка тэм дыпломных праектаў (выпускных кваліфікацыйных работ).
7. Зацвярджэнне для кожнага студэнта графіка індывідуальнай работы па напісанні дыпломнай работы.
8. Збор неабходнага дакументальнага, гістарычнага, іканаграфічнага, літаратурна-мастацкага і іншага матэрыялу для выканання дыпломнай работы.
9. Правядзенне кансультацый са спецыялістамі, якія працуюць у галіне святочнай культуры і прадзюсарскага майстэрства.
10. Стварэнне літаратурнага сцэнарыя на аснове дакументаў, фактаў, гістарычнага і мастацкага матэрыялу.
11. Прагляд і адбор творчых калектываў і ўдзельнікаў мастацкай самадзейнасці ў дыпломны праект.
12. Распрацоўка плана-задання для творчых калектываў.
13. Распрацоўка плана правядзення дыпломнай работы.
14. Адбор і і стварэнне музычнай фанаграмы.
15. Стварэнне музычнай партытуры.
16. Відэаздымка і мантаж відэасюжэтаў для пастановачнага праекта.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

17. Стварэнне эскізаў мастацка-дэкаратыўнага афармлення дыпломнага праекта.

18. Работа над увасабленнем дыпломнага праекта.

19. Правядзенне рэпетыцый (па асобнаму графіку) і індывідуальных кансультацый.

20. Аналіз праведзенага дыпломнага праекта і вынікі па практычным увасабленні задумы праекта.

21. Удзел у падрыхтоўцы і правядзенні абрадава-рытуальных дзей, канцэртных праграм, тэатралізаваных прадстаўленняў, масавых свят згодна планавай дзейнасці базавай установы.

22. Аналіз праведзеных масавых мерапрыемстваў у базавай установе.

23. Абагульненне атрыманых практычных навыкаў і вопыту работы ў працэсе праходжання вытворчай практыкі. Падвядзенне вынікаў практыкі.

24. Падрыхтоўка да абароны справаздачы аб праходжанні пераддыпломнай практыкі.

На абарону пераддыпломнай практыкі студэнт прадстаўляе наступную дакументацыю:

– характарыстыку з ацэнкай дзейнасці практыканта (завераную кіраўніком базы практыкі з пячаткай базавай установы) (*дадатак 2*);

– індывідуальны план работы практыканта (завераны кіраўніком практыкі);

– справаздачу аб праходжанні практыкі;

– дзённік практыкі (завераны кіраўніком базы практыкі з пячаткай установы);

– агульную даведку аб базе практыкі;

– літаратурны сцэнарый і рэжысёрскую дакументацыю дыпломнай пастаноўкі;

– дадатковыя матэрыялы (афішы, запрашальныя білеты, праграмкі, фота- і відэаматэрыялы, эскізы мастацкага афармлення і касцюмаў, службовая дакументацыя);

– відэазапіс свята;

– пратакол прыёму дыпломнай пастаноўкі (з подпісамі і пячаткай базавай установы);

– водгук навуковага кіраўніка на дыпломную работу.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Увесь прадстаўлены матэрыял павінен быть падшытым з афармленнем тытульнага ліста (*дадатак 1*) і прадстаўлены да абароны на кафедру рэжысуры абрадаў і свят.

Вынікам пераддыпломнай практыкі з'яўляецца дыферэнцыраваны залік.

*Патрабаванні да зместу і афармлення індывідуальнага задання і справаздачы па практыцы*

Змест асабістага задання, якое дае студэнту кіраўнік практыкі ад кафедры ўніверсітэта, павінен канцэптуальна адпавядаць задачам кожнага віду практыкі. Пры гэтым асабістае заданне павінна ўлічваць індывідуальныя асаблівасці, творчыя здольнасці і навуковыя зацікаўленні студэнта-практыканта і быць добра зразумелым яму. Змест справаздачы па практыцы адлюстроўвае час, месца, характар выкананай студэнтам даследчай, метадычнай, педагагічнай ці творчай працы на базе практыкі. Афармленне асабістага задання і справаздачы павінна адпавядаць нормам літаратурнай мовы, выконвацца без выпраўленняў і купюр. Пры афармленні асабістага задання і справаздачы ўказваюцца поўныя назвы дзяржаўных устаноў, якія служылі базамі практыкі, і поўныя назвы пасад тых службовых асоб, якія кіравалі практыкай.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# Дадаткі

*Дадатак 1*

Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь
Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»
Факультэт традыцыйнай беларускай культуры і сучаснага мастацтва
(Факультэт завочнага навучання)
Кафедра рэжысуры абрадаў і свят

Справаздача
аб праходжанні (від практыкі)
практыкі

Выканаў:
(прозвішча, імя, імя па бацьку) студэнта
курс, група

Кіраўнік практыкі:
(прозвішча, імя, імя па бацьку)

Мінск, 2018



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ СПРАВАЗДАЧЫ АБ ПРАХОДЖАННІ ПРАКТЫКІ

1. План работы
2. Справаздача па практыцы
3. Водзыў кіраўніка аб праходжанні практыкі студэнта-практыканта
4. Дзённік практыкі
5. Матэрыялы аб базе практыкі (характарыстыка базы практыкі)
6. Дадатковыя матэрыялы (літаратурныя сцэнарыі, іканаграфічны матэрыял, відэазапісы)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Дадатак 2*

ВОДЗЫЎ
аб праходжанні вытворчай (пераддыпломнай) практыкі
студэнта-практыканта (*прозвішча, імя, імя па бацьку студэнта*)
кафедры рэжысуры абрадаў і свят
установы адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

У перыяд з _______ па _______ студэнт кафедры рэжысуры абрадаў і свят установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» праходзіў (*назва віду практыкі*) ва ўстанове (*назва ўстановы*).

Водзыў кіраўніка ад базы практыкі павінен утрымліваць ступень адпаведнасці яго тэарэтычнай падрыхтоўкі ўзроўню, неабходнаму для ажыццяўлення практычнай прафесійнай дзейнасці, а таксама асобасныя якасці студэнта-практыканта:

– узровень прафесійнай тэарэтычнай падрыхтоўкі;
– уменне выкарыстоўваць тэарэтычныя веды на практыцы;
– дзелавыя і камунікатыўныя якасці;
– педагагічная падрыхтоўка;
– дысцыплінаванасць;
– ініцыятыўнасць;
– рэкамендацыі аб прафесійнай дзейнасці студэнта-практыканта;
– рэкамендаваная адзнака па практыцы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

**ПРАГРАМА**
**ВУЧЭБНАЙ І ВЫТВОРЧАЙ ПРАКТЫКІ**

*для спецыяльнасці*
*1-17 01 05 Рэжысура свят (па напрамках),*
*напрамкаў спецыяльнасці*
*1-17 01 05-01 Рэжысура свят (народныя),*
*1-17 01 05-02 Рэжысура свят (тэатралізаваныя)*

Карэктар В. Б. Кудласевіч
Тэхнічны рэдактар А. У. Гіцкая

Падпісана ў друк 2018. Фармат 60x84 $^{1}/_{16}$.
Папера офісная. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 1,69. Ул.-выд. арк. 0,98. Тыраж экз. Заказ .

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/177 ад 12.02.2014.
ЛП № 02330/456 ад 23.01.2014.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ